Цэна асобнаго нумэру 5 кап

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакції і адміністрації: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнції, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакції. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. 23 мая 1913 г. №. 21.

## „Націоналізація".

Чаго, чаго не націоналізуюць у нас у Расеі. Націоналізуюць школы, суды, духавенства, зямлю, церкву і да ўсяго гэтаго людзі ужо прывыклі і не дзівуюцца. Але ваючый правінціональны націоналізм, прыбірае ногды такіе формы, што і падзівацца ёсць чаму і расказаць ёсць што у вясёлай кампаніі. Гэтак нідаўна мінскіе губэрнскіе земцы націоналісты, былі падняўшы праект, каб націоналізаваць на Беларусі... Беларускіх кароў!.. Хацелі нашых «красуляк» і «перэпялёсак» замяніць яраслаўкамі. Факт гэты дробны, мізэрны сам па сабе, але, што ні кажыце—характэрны для нашых вясёлых часоў.

Толькі вясёласць нашых часоў, бадай, на гэтым не дайшоўшым праекце і кончыцца, а за ім, як вокам кінуць, цягнецца сумнае праўдзівае жыцьцё, ідзе доўгі сумны шнур фактоў работы «націоналістоў» і ўжо пачынаюць дзе-недзе паказывацца усходы іхняй сяўбы.

Найперш у нас: земельная палітыка селянскаго, ці як па расейску кажуць «крестьянскаго» банку, дыктывала верхаводам, гэтай самой па сабе карыснай інстытуції, прадаваць зямлю у Беларусі не беларусам-селянам, а стараверам-перэсяленцам і... „праз зямельную цесноту, праз нецастачу заработкоў на мейсцы" разраслася эміграція заграніцу і ў Амэрыку так, што пусьцеюць вёскі. «Міністэрство апрацовывае цяпер праект закону, каб стрымаць эміграцію работнікоў з „окраін". А ці памогуць паліцэйскіе і судовые «меры» таму, каб стрымаць народную хвалю, каторая цяпер хлынула за морэ, шукаючы ня толькі «доляроў» і хлеба, але і пашаны сваіх людзкіх правоў?

«Націоналізація» бье ня толькі нас беларусоў, але і ўсіх, не выключаючы і вялікаросоў. Гэтак „націоналізація" Далёкаго Усходу, куды прыходзілі даўным-даўно кітайцы на работы, як ім забаравілі сяліцца і наймацца на работы там, хлынулі у вялікарасейскіе цэнтральные губэрні і, як пішуць газэты, кітайская хваля што раз большае. А раз праторыўшы сабе дарогу, яна пачне шырэй і шырэй заліваць ўнутрэнные губэрні, бо можэ даць саўсім танные рабочые рукі інтэрнаціональнаму, па свайму характару, капіталізму.

Міністэрство у праекце новаго закону думае звярнуць эміграцкую хвалю з нашаго краю і другіх пагранічных у Усходні Сібір, а з усходняго Сібіру залівае хваля цэнтральную Расею...

Не, каб жыцьцё магло нормальна развівацца, трэба даць яму нормальные варункі. Каб утрымаць эміграцію у Амэрыку, трэба зямлю праз селянскі банк прадаваць толькі мейсцовым селянам, трэба гасіць зямельны голад сярод нашаго селянства, катры яўляецца адзэй з найважнейшых прычын эміграції; даць волю развіваць кожнай націі сваю культуру. Адным словам даць крыху людзям сонца і сьвету на роднай зямлі, а тады гэта іх наймацней будзе трымаць у родным краю і дадасць сіл працаваць над развіцьцем экономічнаго багацьця на мейсцах.

*Власт.*

## Даунае ліха.

Міністэрства фінансоў нідаўна атсьвяткавало 50 лецьце жыцьця акцызнай сыстэмы у Расеі. Афіціальные, казённые газэты і прамоўцы з гэтай прычыны не маглі падабраць слоў, каб выказаць ўсе тые карысьці якіе дала рэформа акцызнай сыстэмы. Пісалі і гаварылі, што „гэта адна з вялікіх реформ XIX сталецьця", што „новая сыстэма павялічыла доход казны з гарэлкі, дала народу лепшую і дзешавейшую гарэлку, мела вялікі ўплыў на падняцьце багацтва гасударства і шмат чаго іншаго ешчэ гаварылі і пісалі.

Разумеецца сьвяткуючы «пьяный юбілей», нельга было не прыпомніць і сам фундамэнт акцызнай сыстэмы—гарэлачную манаполію. Гэтай зручнасьцю скарысталі, каб прасьпеваць гымны энергіі графа Віттэ. Зазначвалося, што ніводзін с папярэднікоў графа, нават такіе выдатные, як міністр Бунге і Вышнеградскій не адважыліся завясьці манаполію. Адзін толькі Віттэ «адважыўся» і 6 чэрвеня 1894 гаду быў зацьверджэн закон аб гарэлачнай манаполії. У результаці, казна мела даходу з гарэлкі у 1863 гаду 128 мільёноў рублёў, а ў 1912 гаду—820 мільёноў рублёў. Розніца вялікая.

Тые, што хвалілі гарэлачную манаполію забыліся, аднача, адну драбніцу, цесна звязаную з манаполіей.

Калі граф Віттэ завадзіў манаполію, ён ведаў, што проці ўраду пачуюцца голасные і справядлівые нарэканьня, за карыстаньне з народнай цемнаты. Каб зрабіць хоць малую уступку грамадзянству, Віттэ пастанавіў завясьці асобные попечыцельствы аб народнай цьвярозасьці: і уставу гэтых попечыцельств зацьвердзілі 20 сьнежня 1894 году, гэта значыць за колькі месяцоў пасьля зацьверджэня гарэлачнай манапаліі.

Усе гэта мела трохі дзіўны і не прыродны выгляд, што казна аднэй рукой будзе збіраць даходы з гарэлкі, а другой рукой будзе змагацца с пьянствам. Але сам урад быў дужа здаволены з гэтай выдумкі.

Мінула ужо каля 20 гадоў с таго часу, як манаполія і попечыцельствы жывуць побоч с сабой, настаў вось ужо і юбілей акцызнай сыстэмы, а што зрабілі попечытельствы? Што дала казьне манаполія—гэта усім ведама. У 1895 гаду, калі толькі зачалі завадзіць манаполію, казна мела з яе, ня лічучы іншых гарэлачных даходоў, 23 мільёны рублёў, а 1812 гаду даход з манапольکі дайшоў ужо 820 мільёноў рублёў. Цэна звычайнай гарэлкі паднялася с 6 р. 40 кап. да 8 руб. 40 кап., а сталовай з 10 руб. да 12 руб. Чысты даход казны за ўвесь час жыцьця манаполек дайшоў 5,653 мільёноў рублёў. Гэта усё карысьці якіе мела казна з гарэлачнай манаполії, але калі узяць пад увагу страты, якіе сталіся ў народзе ад узросту пьянства, то шкоднасць гарэлачнай манаполії станецца саўсім яснай.

*Р.*

## Не адным хлебам...

Сказана у Біблії: „не адным хлебам чэлавек жыў будзе",—і гэта шчырая праўда, бо каб чэлавек мог здаволіцца толькі ядой, ён не лічыўся-б вышэй другіх стварэньнёў на зямлі. Апрача хлеба ўрываюцца у яго жыцьцё духоўные патрэбы, каторые усякі чэлавек па своему стараецца здаволіць. Агульна узяўшы усе праявы духоўнаго жыцьця, каторые аскрыдляюць душу чэлавека, паднімаюць яго у высь, можна назваць: *хараством.*

Сьвятое адвечнае хараство! На зямлі німа нічога вышэйшаго за цябе!... Ты адно чыстае, яснае, без жаднай пляміны... Ты злучаеш чэлавека с праўдзівым Богам, з добрым, усёдаровываючым, сьвятым Богам зямлі...

С самаго начатку чэлавечай культуры людзі, ешчэ дзікіе, цёмные, зрабіліся тваімі шчырымі паклоннікамі і хоць у грубых формах складалі табе сваю пашану і славілі цябе. Розные культы, розные веры паўставалі, перэменяліся і зafміралі, як мары паўночные; розные філасофії прахадзілі на экране чэлавечых мазгоў і новые тэорыі, новые мысьлі касавалі іх. Толькі адно хараство адвечна стаіць, як багіня на сваім высокім аўтары...

— Што гэта хараство? пытаемся мы; і цікава тое, штосамо пытаньне заўсёды зьяўляецца апасьля таго, як мы скаштавалі ужо гэтаго дзіўнаго напітку, як нашэ пачуцьце знаходзіцца ужо ў межах хараства. Раней пытацца нельга,—ўсё роўна, як не радзіўшэмуся чэлавеку нельга пытацца—што такое жыцьцё? Хараство—маці жыцьця, кіраўніца дабра і праўды. Хараство—гэта гармонічна скрысталізаваные жыцьцёвые атомы, каторые губляючы сваю даўнейшую хаотычнасць уходзяць у цыкль кемнасьці, штукарства.

У розных вопратках зьяўляецца яно: у музыцы, у паэзії, у малярстве, у рэзьбярстве, у будоўніцтве, у рэмёслах, у звычаях рэлігійных і сьвецкіх. Жыцьцё можна назваць кветкай,—хараство мёдам гэтай кветкі, а чэлавека—пчаліной збіраючай гэты мёд. Паўтараю хараство або штукарства (артызм) гэта сама прырода ў кароне сваей вялікай творчасьці.

Усе народы зямлі моляцца хараству адным магутным гымнам, толькі гымн гэты у кожнаго народу мае свой асобны лад, каторы вытвараецца над уплывам акружаючай яго прыроды.

Кожны народ мае свой асобны стыль ва ўсіх праявах штукарства. У стылю, способе выяўляць хараство красуецца душа народу, яго асобны характар, асобнае жыцьцё, асобнае паняцьце хараства.

Калі жадаем грунтоўна пазнаёміцца з жыцьцём якога калечы народу, то трэба узяцца за яго сьвятые кронікі—яго штукарства, аткапаць, вывесьці на сьвет, калі яно заценена, і спазнаць яго.

Гэту вось працу, як-раз цяпер павінны мы беларусы паставіць на першы чарод.

Многапакутная, асірацелая старонка наша! Колькі гора і несправядлівасьцей ты перэнесла: твае сыны ня ведалі і не хацелі ведаць цябе с тваім багатым скарбам!..

А зірніце толькі аткрытымі вачамі на наш народ і вы убачыце нешта пекнае, дарагое, пакрытае пылам вашай недбаласьці...

Зірніце... Зусім асобны, забыты куток на зямлі... Сваімі рэчкамі, лугамі, балотамі, лесамі; сваімі звычнымі, хапаючымі за душу песьнямі, музыкай, казкамі, бывальшчынай; сваімі характэрнымі будоўлямі, рэзьбярствам, тканінамі; сваімі танцамі, гульнямі, звычаямі,—усім тым, ў чым выяўляецца асобная, таёмная, а такая дзіўная містэрыя нашаго народу, ці не папхне вас каб спазнаць усё гэта, выведаць і паказаць сьвету ўсяму!..

Хто мае сьвяты агонь у сэрцы сваім, хай не стаіць з боку, а хай бярэцца гарача за працу над пазнаньнем хараства нашай старонкі нашаго народу. Ніхай прытуліцца гарачым сэрцэм да зямелькі-маткі роднай і вокам загляне глыбока, глыбока ў жыцьцё: ў зямлю аж-да дзедаўскіх костак, ў людзей—да бяздоні душ, у край,—праз усе яго долі, да першых дзён і спазнае душу сваей зямлі, душу народу у найцікавейшых, у характэрных праявах, каторые выліваюцца у песьнях, казках звычаях.

Трэба ўсе песьні, звычаі і ўсё іншае ў чым праяўляецца душа нашаго народу збіраць, запісываць, зарысовываць, фотографваць, бо ва ўсім гэтым крыецца, характэрная,—наша частка,—агульна людзкога *хараства.*

**Змітрок Бядуля.**

## З нашаго жыцьця.

### Эміграція у Амэрыку.

Цяжкая доля і цемната гоніць нашаго беларуса ў чужую старонку, гдзе ён стараецца зарабіць грашака на сваю патрэбу, бо ў нашай сторонцы, праўду сказаўшы, каб хацеў, нігдзе не зарабіш асьмака. Бывала, ў старые гады, лет таму 30—40, калі ў нас усё было танна, ніхто ня рупіўся на чужую старану; жылося ў нас, ні саўсім блага. Цяпер так стала трудна зарабіць грашака, што рад, чы ня рад, кідай гаспадарку, сямью і ўцекай ў амэрыку. А ў Амэрыцы, як гавораць, чэлавек вольны; ён там роўны са ўсімі, ніхто у яго не пытае пашпарту і з ім абходзяцца, як с чэлавекам роўным сабе. Ось цяперыка нашы беларусы хвалею хлынулі ў Амэрыку. Адзін свяшчэнік мне гаварыў, што з аднаго прыходу, ў которым было парахвіян 8 тысяч, цяпер асталося 6 тысяч трыста душ. Уся маладзеж, нават і дзеўчаты выежджаюць ў заморскую старану—Амэрыку. Цяперыка я раскажу, як яны туды едуць. У кожным мястэчку ёсьціка патэнтаванные і тайные агенты, што атпраўляюць людзей ў амэрыку. Ось да іх то, хто хочэ ехаць, звертаецца. Патэнтаваны агент за 200 руб. саглашаецца па заграничнаму пашпарту даставіць чэлавека у Амэрыку, ён ужо і пашпарт выстараецца, а калі німа грошы, то і пажычыць на вэксэль за 36 прац. Прыехаўшы у Амэрыку, канешне трэба мець на першы пачатак 50 руб. і каго небудзь знаёмаго, чы сваяка, штобы заручыўся і прыняў да сябе. Але гэта ешчэ ня ўсё. На прыстані дахтары шчыльна рэвідуюць эміграната, каб ён быў здаровы і моцны да работы, а то с карабля яго ня выпусцяць. Перэпрашаю дарагога чытача, што я ня ўспомніў ешчэ аднаго важняго варунку. Калі чэлавек задумаў ехаць у Амэрыку, ён ешчэ павінен пайсці да дохтара, чы да хвэйчара, каб яго агледзіў, чы німа якой цяжкой хваробы—сухот, трахомы. К стыду сказаць у гэтых дахтароў і хвэйчароў кожны чэла-

Срогай і шырокай
Вее мне на душу
Смутнасьцю глыбокай.
А наўкруг весьняны
Раначэк іграе.
Жаўрук ў паднябесьсі
Жыцьцё прывітае.
Скуль жэ ж гэта песьня
Смутку узялася,
Калі ўся прырода
К жыцьцю паднялася?
Што-ж гэта за песьня,
Яна не падходзіць
Да тае, што жыцьця
У гэты ранак родзіць?
З лесу кучка люду
Зважна выезджае,
На апошнім возі
Трунка дрэвяная.
Чы весна, чы восень,
Сьмерць не запытае,
Толькі стаў ты жыці—
Яна адрывае.
Вось ужо й ня чутна
Сумнай песьні болей.
Закацілось жыцьцё,
Разам с труднай доляй.
Но прыр да—маці
Песьні тэй ня чуе,
Жыве сабе вечна
Над сьмерцьцю папуе.

М. Арол.

# ДУДАР.

### Ахвярую Э. Русецкаму.

Грай, дудар, чаго ты змоўчаў?
Мо жалееш ты грудзей,
Або песні свае скончыў.
Ты, над—Дзьвінскі салавей?
Дзьмі крапчэй—узноў пальецца
Песьня валам, ды ня трусь,
Што ад песьні ўскалыхнецца,
Як ад грому, Беларусь!
Націскай мяшок скураны
Пальцы шыбчэй ў ход пушчай!
Скінь жуду, ды будзь рахманы...
Што-ж маўчыш, брат—пачынай!
Можэ хочэш на подмогу
Ты мяне к сабе прыняць?
Я патраплю дзякуй Богу,
Мог і добра я пеяць.
Як-са знаеш—тваё дзела;
Толькі пара быў бы я:
Яб за шчыгла пеў-бы сьмела,
Ты з дудой за салаўя.
Ні шманай—паладзіш скора:
Голас чыст мой, як дуда;
Знаў ён слёзы, знаў і гора,
Товіст крыху—ўся беда.
А мо на ліха й добра будзе:
Товка ты, а я таўсьцей,
Як калі прымерна ў лузе
Із зязюлькай салавей.
Гукнем-ж дудар! гэй ня трусі
Годзе моўчкам нам стаяць:
Час прышоў для Беларусі
Песні радасны пеяць!
Знаюць хай: за час спакою
Беларускі дух ўсё жыў
І маўчком ён сам с сабою
Песьні гэтые злажыў.
І злажыўшы звонка, стройна
Нам с табой стаў пеяць.
Гукнем-ж громка і спавольна
Стыду посьлі каб не знаць.
Панатужым свае грудзі—
Духу хваце, гэй ня трусь
Хай жэ знаіць сьвет і людзі,
Што пяець ім Беларусь!..
Як калісь-то шчаснай долі
Ні за морам ужо дзень:
Бачце—сьцелецца па полі
Яго вогністы прамень
Скора, скора запылаіць
Ен над роднаю зямлёй
І навекі развітаіць
Нас с прадвечнай цемнатой.
Замест слёз, пагарды мукі
І змаганьня з галатой,
Дасць нам сьвету і навукі
І багацтва і спакой.
І пакажэм мы што маем
Усё ня пушчэй ад людзей:
Мову нашу, што гукаем
С песьняй звонкаю, сваей,
Талент к штукам і навуцы,
Прагнасьць знаньня і любоў,
Да работы сілу ў руцэ
Да барбы шалёну кроў.
Словам маем ўсё, што трэба,
Усё даўным даўно Бог даў
Толькі ўсё, што дало неба
Чэлавек сабе забраў.
У гэтым мала мы зрабілі.
Зрабіць болі было як?!
Калі нас усе душылі
Хто мог пхаў у свой кулак
Дзякуй Богу і затое,
Што наш дух саўсім ня зьнік
Бо атнялі ўсё людзкое:
Скарб духоўны і язык.
І на жарты чэлавекам
Ніхацелі нас назваць:
Як звяры, усякім здзекам
Той к сабе—змагаліс брацы...
Хай-ба крыўдзілі ня ў меру
Цела плёткай ці агнём,
А то нават й тую веру
Варачалі па сваём.
Й так пакінулі бадзяцца
На пакуту ці на сьмех,
(Мусі болей здзекавацца
Ткі начулі ў серцы грэх),
Мужыка бяз мовы, сьвету
Здабываць для пана хлеб,
І цярпеў сталецьця гэту
Муку ён нямы і сьлеп
Но прайшлі часы ліхіе
Сьвет зьнямог адвену цьму,
Путы лопнулі стальные
Павальней стала яму.
І цяпер, ні так мо скора,
Хмара покі перайдзе,
З вечнай крыўды, сьлёз і гора
Ен ўжо вызваліць сябе.
Апрануўшыся, рахманы
Выйдзе с цемры беларус,
Загаіўшы цяжкі раны
Стройны, крэпкі, бел і рус
Гляне ён на сьвет вясёла.
Жаль спадзе с прыгожых век
Но ужо цяпер ні як жывела
А як вольны чэлавек.
Што далей за гэтым будзе,
То павінен кожын знаць,
Нам-ж пеяць прыстаті грудзі
Дудар!—можэм перастаць!
Скора мы ешчэ с табою
Узноў сайдзёмся папяём
І то болей мы с сабою
Песень новых прынясём
А цяпер бывай здаровы
Ды мяне ні забывай
І гасцей для песні новай
Там з Дзьвіны сваей зывай.

Янук Пачопка.

## З Беларусі і Літвы.

### Вільня.

#### У справе унівэрсытэту.

Справа аткрыцьця унівэрсытэту у Вільві пачынае ізноў выплываць на верх. Нідаўна міністэрства асьветы звярнулося да віленскай гарадзкой управы раючы выбраць дэлегатоў, каторые-б у Пецярбурзе вылажылі чаму патрэбен у Вільні унівэрсытэт, якіе факультэты і інш.

#### Жарты школьнаго округа.

Віленскі школьны округ паслаў у бабруйскую прыватную мужскую гімназію Годышчскаго-Цьвірко, для выпускных экзаноў дзьве задачы. Выявілося, што аднэй з гэтых задач нельга было зрабіць, бо яна была саўсім бязглуздая. Але вучыцель, на свой рыск перэрабіў тут-жэ умову задачы і паясьніў неправільнасць „памылкай округа“. Ды і другая задача не была лепшай: адказ на яе выходзіў «дробны», тады, як вымагалося даведацца чысло коней і кароў. Задач, ведама, не зрабілі вучні. Найлепшые матэматыкі гораду і вучыцелі гімназіі прызналі, што абедзьві задачы—неправільные. Чым кіраваўся округ, пасылаючы гэткіе задачы—нетведама.

#### Сельска-гаспадарская выстаука у Глыбокім.

У Глыбокім (Дзіс. пав. Віл. губ.) адбылася 14 і 15 чысла гэтаго месяца сельска-гаспадарская і хатняго промыслу выстаўка. Каней і кароў было не шмат на выстаўцы, ды і то ў добрай палавіне была ўсё скаціна дворная, панская, а ведама, хто мае грошы можэ мець і добрую скаціну, калі купіць за іх яе. Дык было скаціны і добрай. На выстаўку хатняго рэмесла найбольш пананосілі бабы розных палоцен і паўсукенкоў. Паміж палотнамі было німала цікаваго, як колерамі, так і узорамі. Ткацтвам у нас займаюцца кабеты ў кожнай хаці, але не на промысел, не на продаж, а толькі «для сябе». Дык і выстаўку у Глыбокім можна назваць прамысловай хіба толькі с таго боку, што бабы «прамышлялі» як узяць награду. Наград было раздадзена не мала, але на ўсіх баб не хапіло (а было больш 150 баб са сваімі выробамі) дык іншые вынесьлі з выстаўкі ня мілае расчараваньне. З недахватоў выстаўкі варта адмеціць тое, што бабы трымалі свае экспонаты у вузлах, часта сеўшы на іх і дзеля гэтаго нельга, а прынамсі трудна, было, разгледзіць што было на выстаўцы. Трэба было-б камітэту, каторы займаецца выстаўкай мець большы будынак пад выстаўку і прымаць ад баб пад запісь усе экспонаты, а на гэта трэба, каб яны прынасілі загадзя свае выробы, нумэраваць іх і выстаўляць цэны на кожную рэч. Пасьля экспонаты развешываць, каб усё было відаць, а каб не сцягівалі экспонатоў госьці, зрабіць на адлегласьці аршына—паўтара барьерку і паміж экспонатамі і барьеркай паставіць вартаўнік ў, хоць-бы і тых самых баб. Цэны выстаўляць трэба канечна ешчэ дзеля таго, каб прывучаць кабет да промыслу. Апрача гэтаго камітэт павінен што-году купляць крыху рэчэй і памаленьку камплетаваць свой акалічны музэй хатняго промыслу. Музэі такіе маглі-б месьціцца пры мейсцовых школах, касьцёлах, цэрквах. Ткацкая глыбоцкая школа, прынамсі цяпер, нічога ня можэ даць новаго нашым селянкам, бо хоць бы на выстаўцы выробы некаторых селянак на цэлае неба вышэй стаялі, ад ручнічкоў і маскоўскіх сарпінак, каторые выставіла вучыцелька школы.

На выстаўцы быў атдзел „Сахі“

і сеў пазіраючы на тую яму што так ні далёка ужо была.

Чырвоные плямы закрасаваліся на жоўтым пяску і промені сонца выпаўзьлі з-за зялёнаго куста і доўга асвечалі цела галоднаго бедака.

*Галубок.*

## З беларускіх казак.

### Ілья і Пятро.

Даўно тое было, як ешчэ сам Бог па зямлі хадзіў. Атдаў Бог увесь сьвет Ільі і Пятру. Але, ведама, дзе два паны, там ніколі ладу німа. Адзін пасылае дождж, а другі—пагоду. Плачуць хмары, ня ведаюць, што рабіць, каго слухаць. Пойдзе дождж, то Пятро бяжыць ды крычыць, лаецца, на чом сьвет стаіць:—што вы, тулягі, робіце, на што мочыце сена, цяпер-жэ людзі косяць!—Нам,—кажуць,—Ілья загадаў—Ах вы, дурные,—лаецца Пятро—я вам пакажу Ілью! Ілья заўсёды наробіць гнільля.—Схопіць Пятро мятлу і паразганяе хмары па кутках і чысьценька падмяце неба. Ды ось аткуль ні вазьміся, тарахціць, едзе Ілья, крычыць, як на жывот, аж неба і земля дрыжаць. Хмары таўкуцца, як непрытомные; вылазяць с куткоў, і ўжо ліне такі дождж, што ня толькі берагі, але й груды паплывуць. Жаляцца людзі Богу, што паны дзяруцца, а ў мыжыкоў хахлы трасуцца, жаляцца й просяць, каб Бог даў пагоду. Прызаве Бог Ілью, насварыцца на яго, а той кажэ, што гэтулькі развялося на сьвеці нечысьці—чарцей, што трэба іх громам пабіць, бо ўвесь сьвет запаганяць. Прызаве Бог Петра і кажэ:—чаго ж, васпан, узняўся, ніхай Ілья трохі папалюе чарцей.—А Ілья тымчасам падніме такіе грымоты, што аж земля стогне: німа ні дня, ні ночы; хмары таўкуцца, як ў'юны у рэшаце; на небі кіпіць, як у гаршчку; маланка бліскае, аж у ачу цёмна становіцца, а пярун смаліць раз-па-разу, палосуе хвоі, дубы ды паліць будоўлю, або стагі. А Ілья ездзіць сабе па небу ды камандуе.—Так, так, так! Го-го-го! ешчэ, ешчэ... Лупі, лупі яго гада... От так, так... Трэсні яго ў патыліцу. Го-го-го. У патыліцу, у патыліцу лупі яго гада! Трах, трах! Так-так-так! Го-го-го!

Просяць людзі на прамілы Бог, каб уняліся грымоты, а Ілья ня слухае. Ходзіць Пятро ды плюецца ад злосьці. Нацешыцца Ілья, пачысьціць сваю каляску і паедзе к сонейку у госьці. Тут Пятро падмяце неба ды давай сушыць зямлю. От ужо падходзіць пара сеяць жыта, а земля сухая, як прысак—зноў беда! Беда ужо, што німа дажджу. А Ілья сваволіць сабе с сонейкам, а пра зямлю і забыўся. Ні маюць вока адзін на другога Ілья і Пятро, сярдзітые, баяцца, каб і не сустрэцца...

Але от раз уздумалі яны пахадзіць па зямлі, папытаць людзей, каго яны больш любяць, Петра, ці Ілью. Як сышлі яны на зямлю, дык па немалым часе і сустрэліся. Ідуць яны разам і спіраюцца: Пятро кажэ, што яго больш любяць людзі, а Ілья кажэ, што яго. Як дакапацца, чыя праўда? Бачыць яны, аж чэлавек сее грэчку.

— От—кажэ Пятро—давай, папытаем, каго мужыкі больш любяць.—Папытаймося—кажэ Ілья.

— Памагай Бог!—кажэ Пятро.

— Дзякаваць.

— Скажы, добры чэлавечэ, каго вы больш любіце, Петра, ці Ілью?—Мужык зняў с плеч сявок, паставіў яго на зямлю, пачухаў патыліцу дый кажэ,—а багі яго ведаюць. каго мы больш любім; мо Ілью, а мо Паўло-Петра?

— Ты не гарадзі плоту—кажэ Пятро,—а кажы проста.

— І Ілья і Павал-Пятро—добрые сьияткі; мы іх і любім.

— А каго больш?

— Бачыць мужык, што тут ня выкруцішся і кажэ;—пэўне-ж Паўла-Пэтра—Аж затросся Ілья ат злосьці. Пашлі яны далей, а Ілья і кажэ;—Ого ж спяку я за гэта яму ніву—нічога не зародзіць.—А Пятро кажэ: а я намачу і зараджу.—Калі так, дык я зраблю ось як: хто першы укусіць з гэтае нівы перапеч, то падавіцца. Ухмыліўся Пятро і пашлі яны далей. Было вельмі добрае тое лета: аб дзень пагода, цёпла, а ў ночы ці цёплая раса, ці ціхенькі, цёпленькі дождждык. Расьце усё, як на дражджах; здаецца, пасадзі на поле дзіця, то й тое вырасьце. Зрадзіла грэчка па пояс, аж палегла. Набіў мужык поўгумна. От намалаціў ён грэчкі, намалоў, і напекла баба сьвежых перапеч, поўну печ. На той час прыходзіць у тое сяло Ілья с Пятром і заначэвалі у таго мужыка. Забыўся Ілья, не спазнаў таго мужыка. От селі яны вячэраць.

— От-жэ, дзякуваць Богу,—кажэ мужык,—зарадзіла сёлета грэчка, пробуйце госьцікі сьвежых перапеч.—А Ілья такі добра прагаладаўся. От ён як захапіў перапеч, дык і станула яна яму у горлі. Ен туды-сюды вадою запіваць і кулаком біць у грудзі і ў сьпіну—от хоць-бы што. Дагадаўся ён тагды, што гэта праклятые ім перапечкі; і давай ён перапрашаць мужыка й Петра, дык насілу ачухаўся.

От с тае пары годзі Ілья мешаць людзям сена касіць... Але усё было-б добра, каб Пятро ня быў такі стары ды глухі. Бог, напрыклад, кажэ яму: пасылай тагды дождж, як людзі просяць, а ён не дачуе ды й пасылае дождж, як людзі косяць...

*Перэсказау І. Азэміша*
*Лучыцы, Слуцк. пав.*

